# РУХ за свабоду

Бюлетэнь ПАГА "Рух "За Свабоду". Выпуск № 7 жнівень 2011

Праходзяць сходы рэгіянальных структур Руху – с.3

Маўклівыя пратэсты і перамены – с.4-5

Халодны подых вялікадзяржаўнасці – с.6

Прафесійная армія альбо вайсковая павіннасць – с.7

# Маці за сына

**Актывісты Руху "За Свабоду" атрымалі суцэльныя адмовы на пададзеныя па ўсёй краіне заяўкі (больш за сотню) на правядзенне пікетаў, прысвечаных становішчу паплечніка Мікіты Ліхавіда, які адбывае пакаранне 3,5 года калоніі за падзеі 19 снежня 2010 года і трывае дадатковы ціск за кратамі.**




Больш за палову часу ў зняволенні 21-гадовы хлопец знаходзіўся ў штрафным ізалятары, бо называе сябе незаконна асуджаным і адмаўляецца выконваць правілы "зоны". А цяпер яго наогул змясцілі ў памяшканне камернага тыпу.

У Мінску пікеты не дазволілі нават на Бангалоры. Сярод іншых адмовы прыйшлі на два звароты ад імя старшыні Руху "За Свабоду" Аляксандра Мілінкевіча наконт пікетаў на Кастрычніцкай плошчы і ў Кіеўскім скверы.

Кастрычніцкая плошча пад забаронай, таму што "правядзенне масавых мерапрыемстваў не дапускаецца на адлегласці менш 200 метраў ад падземных пешаходных пераходаў, станцый метрапалітэна" (у Мінгарвыканкаме спаслаліся на ч.3 арт.9 Закона "Аб масавых мерапрыемствах у Рэспубліцы Беларусь"). А вось пікет на тэрыторыі Кіеўскага сквера на пляцоўцы каля фантана не дазволілі праз запланаваны рамонт гэтага самага фантана і добраўпарадкаванне прылягаючай тэрыторыі. Каля ўніверсама "Першамайскі" пікетаванне нельга праводзіць, бо яно "будзе ствараць перашкоды для пешаходнага руху побач з будынкам універсама і для яго бесперабойнага функцыянавання".

Працяг на с.2



***Мікіта Ліхавід:***

*"Я ішоў на плошчу таму, што хачу жыць у свабоднай краіне. Каб у міліцыі служылі годныя людзі, каб працоўныя ганарыліся сваёй прадукцыяй, каб моладзь не співалася да 30-ці гадоў".*

## Дзевяць асуджаных удзельнікаў акцыі пратэсту 19 снежня выйшлі на свабоду

Сталі вядомыя некаторыя прозвішчы вызваленых. Гэта – Зміцер Дрозд, Арцём Грыбкоў, Сяргей Казакоў, Андрэй Пратасеня, якія адбывалі пакаранне ў Бабруйскай калоніі.

Нагадаем, учора з'явілася інфармацыя, што Лукашэнка памілаваў 9 актыўных удзельнікаў акцыі пратэсту 19 снежня 2010 года. Усяго да крымінальнай адказнасці "за арганізацыю масавых беспарадкаў і ўдзел у іх" летась 19 снежня было прыцягнута каля 40 чалавек.

Паводле наяўнай інфармацыі, экс-кандыдатаў у прэзідэнты сярод дзевяці памілаваных няма, бо ні Мікалай Статкевіч, ні Дзмітрый Ус, ні Андрэй Саннікаў прашэнняў аб памілаванні, якія з'яўляюцца фармальнай умовай для разгляду пытання, не падавалі.

Як вядома, актывіст Руху "За Свабоду" Мікіта Ліхавід таксама адмаўляецца прасіць аб памілаванні, паколькі лічыць сябе незаконна асуджаным.

САЛІДАРНАСЦЬ

# Маці за сына

працяг са с.1

Баранавіцкі гарвыканкам забараніў пікет у падтрымку Мікіты Ліхавіда таму, што, маўляў, заяўка арганізатара не адпавядае арт.5 Закона "Аб масавых мерапрыемствах" і рашэнню гарвыканкама ад 16 чэрвеня 2009 года. Праўда, заяўніку не сказалі, што канкрэтна не адпавядае закону і рашэнню мясцовай улады. Кіраўнік мясцовай арганізацыі Руху Віктар Сырыца лічыць, што ён не парушыў дзеючае заканадаўства і склаў заяўку правільна. Месца прасілася, у прыватнасці, дазволенае для такіх мерапрыемстваў.

Наваполацкі гарвыканкам паведаміў заяўнікам пікету, што сваім рашэннем ад 22.07.11 № 689 "Аб масавых мерапрыемствах у горадзе Наваполацку" плошча ля гарадскога Палаца культуры па вуліцы 5-я Лінія выключаная з пераліку месцаў, дазволеных для правядзення масавых мерапрыемстваў.

Аднак заяўка падавалася 18 ліпеня – за два тыдні, як таго патрабуе заканадаўства. То бок, змены ў рашэнне аб масавых мерапрыемствах чыноўнікі ўнеслі пазней, праз чатыры дні.

Акрамя таго, тлумачачы адмову ў правядзенні пікета, улады ўказалі на тое, што арганізатары не заключылі адпаведныя дамовы з міліцыяй (на ахову грамадскага парадку падчас масавага мерапрыемства), цэнтральнай гарадской бальніцай (на медыцынскае абслугоўванне) і камунальнай гаспадаркай (на ўборку тэрыторыі). Аднак, там у сваю чаргу казалі, што спачатку трэба атрымаць дазвол на правядзенне пікета. Звычайнае зачараванае палітычна-бюракратычнае кола. Гэтая адмова, як і шэраг іншых, будзе абскарджаная.

На заяўку аб правядзенні пікета ў Светлагорскім раёне прыйшоў такі дзіўны адказ: "Змест вашай заявы не адпавядае вышэй названаму рашэнню". Дзіўны, бо пра якое рашэнне вядзецца гаворка – засталося незразумелым.

*"Рэжым у складаныя для сябе часы не хоча, каб існавала любая актыўнасць грамадзянаў. Бо гэта стварае пагрозу "снежнага кому". Таму ўлады ўсіх узроўняў зараз робяць усё, каб заблакаваць праявы пратэсту ці салідарнасці"*, – пракаментаваў татальную адмову па пікетах дарадца старшыні Руху "За Свабоду" Алесь Лагвінец.

*"Несанкцыянаваныя пікеты праводзіць не мае сэнсу. Бо, калі дадзеная ўстаноўка на забарону, іх усё адно не дадуць правесці і разгоняць. Гэта значыць, падставіць актывістаў пад рэпрэсіі – і не данесці ў выніку інфармацыю да людзей. У любым разе працягнецца распаўсюд інфармацыі пра Мікіту Ліхавіда, прычым у нечаканых для ўладаў месцах"*, – кажа намеснік старшыні Руху "За Свабоду" Юрась Губарэвіч.

А гэта стала яшчэ больш актуальным. Мікіта Ліхавід даслаў на волю ліст, у якім паведаміў пра абцяжарванне ўмоваў знаходжання ў Наваполацкай калоніі №10. Яго змясцілі ў памяшканне камернага тыпу – для парушальнікаў рэжыму, якія не паддаюцца выпраўленню. Змясцілі на тры месяцы. Бліжэйшым часам са зняволеным актывістам Руху сустрэнецца ягоная адвакатка Дар'я Ліпкіна, якой удалося прайсці пераатэстацыю.

Юрысты кажуць, што перавод у ПКТ у статусе злоснага, сістэматычнага парушальніка азначае, што зняволены не зможа разлічваць на ўмоўнадатэрміновае вызваленне. Апрача гэтага, яго чакаюць на час змяшчэння туды забарона на ліставанне і спатканні. Далей Ліхавіда могуць перавесці ў калонію турэмнага тыпу ў Гродне: там асуджаныя сядзяць у суцэльнай ізаляцыі.

Між тым, ціск фізічны ў дадатак да маральнага аказваецца і на маці Мікіты Алену Ліхавід. Яна была затрыманая падчас адной з акцыяў маўклівага пратэсту і асуджаная на 10 сутак арышту. На Акрэсціна кабета выступіла ў якасці праваабаронцы зняволеных – патрабавала, каб да іх ставіліся гуманна, праветрывалі камеры. У выніку яна на тры дні апынулася ў адзіночнай камеры.

Пасля вызвалення Алена Ліхавід заявіла, што цяпер у яе ўнутры нязломны стрыжань. Усімі здзекамі яе не зламалі, а толькі загартавалі. *"Трывае Мікіта, вытрываю і я. Я стала больш моцнай"*, – кажа яна.

ПРАВААБАРОНА

# Рух "За Свабоду" выступіў у абарону кіроўцаў

Паводле юрыстаў аб'яднання, Пастанова Саўміна ад 10 чэрвеня 2011г. № 753 "Пра некаторыя пытанні рэгулявання вывазу аўтамабільнага паліва з тэрыторыі Рэспублікі Беларусь" парушае правы грамадзян на свабоду перамяшчэння. З гэтай нагоды накіраваны зварот у Канстытуцыйны Суд.

Згодна з Пастановай, кожны, хто перасякае мяжу на аўтамабілі болей за адзін раз цягам пяці сутак не мае права вывозіць аўтамабільнае паліва нават у баку свайго аўтамабіля, бо яно, паводле чэрвеньскага рашэння ўраду, не можа лічыцца таварам для ўласнага карыстання. Працэдура вывазу паліва ў гэтым выпадку не выпрацавана, што фактычна абмяжоўвае правы на выезд грамадзян за мяжу ўласным транспартам.

***Больш падрабязна на www.pyx.by***

# Мілінкевіч: “Лакальная актыўнасць для нас вельмі важная”

**Услед за Гомелем апошнімі тыднямі ў Брэсце, Віцебску, Мінску і Магілёве адбыліся ўстаноўчыя сходы абласных і сталічнай арганізацый Руху дзеля далейшай іх рэгістрацыі.**




Абраныя Рады і кіраўнікі рэгіянальных суполак: старшыня мінскай – Юрась Меляшкевіч, віцебскай абласной – Хрыстафор Жаляпаў, на Магілёўшчыне – Алесь Сілкоў, на Брэстчыне – Зміцер Траццяк, на Гомельшчыне– Пётр Кузняцоў.

Удзел ва ўстаноўчых сходах у рэгёнах брала кіраўніцтва Руху – старшыня Аляксандр Мілінкевіч, ягоны намеснік Юрась Губарэвіч і дарадца Алесь Лагвінец.

*“Калі хочам мець арганізацыю, якая дзейнічае, якая эфектыўная, то мусіць быць пабудаванне структуры. Мы не партыя – у сэнсе тым, што мы зверху даем каманды, а на нізе павінны выконваца. Мы грамадска-палітычны рух, і ў нас ідуць нізавыя ініцыятывы. Лакальная актыўнасць для нас вельмі важная. І мы не толькі будзем запрашаць людзей да ўдзелу ў кампаніях, якія будуць у Мінску, але таксама хочам, каб яны на месцах ініцыявалі тое, што трэба тут”*, – кажа Аляксандр Мілінкевіч.

Юрась Губарэвіч зазначыў, што гэта дасць магчымасці для больш плённай працы, у тым ліку для ўплыву на грамадскую думку і па пошуку новых лакальных лідараў. Адна з галоўных задач – выкладанне грамадству пазітыўнай альтэрнатывы. Інструменты для гэтага – кампанія “Народная праграма”, сетка Еўрапейскіх клубаў, Народны універсітэт, які ствараецца.

Алесь Лагвінец адзначыў, што грунт для пазітыўнай альтэрнатывы – прабеларуская еўрапейскасць.

Аляксандр Мілінкевіч выказаўся таксама наконт сітуацыі ў краіне і стану апазіцыі.

На думку Мілінкевіча, рэвалюцыйнай сітуацыі ў краіне пакуль няма, а падзеі могуць развівацца па трох сцэнарах.

Першы: улады прадаюць Расіі тое, што яна хоча, і гэта ненадоўга выратоўвае сітуацыю ў эканоміцы. “Але гэта здача эканамічнага суверэнітэту, а затым – палітычнага”, – перакананы кіраўнік Руху.

Другі варыянт развіцця падзеяў: Лукашэнка разумее, што патрэбныя не столькі крэдыты, колькі

> *Рух можа стаць ініцыятарам стварэння шырокай правацэнтрысцкай партыі*

структурныя рэформы, якія магчыма правесці з дапамогай Еўрасаюза. У такім разе пасля вызвалення і рэабілітацыі палітвязняў можа пачацца дыялог з далейшай мадэрнізацыяй краіны.

Трэці шлях – самаізаляцыя.

Не выключае Аляксандр Мілінкевіч і сацыяльнага выбуху ў выніку эканамічнага крызісу і падзення ўзроўню жыцця, але прагназуе, што людзі будуць патрабаваць хутчэй не свабоды і еўрапейскага шляху, а парадку і моцнай рукі.

Стан апазіцыі ад 2007 года, калі дэмакратычныя сілы вырашылі дзейнічаць без адзінага лідара, ён назваў крызісным. На думку старшыні Руху “За Свабоду”, 9 кандыдатаў на апошніх прэзідэнцкіх выбарах – праява слабасці.

Мілінкевіч заявіў, што з’яўленне адзінага лідара ў апазіцыі цяпер малаверагоднае, але працаваць паводле адзінай стратэгіі яна абавязаная.

*“Страчаныя Лукашэнкам людзі пакуль да нас не прыйшлі,* – канстатаваў ён. *– Мы не сталі для народа альтэрнатывай цяперашняй уладзе”.*

Змену сітуацыі Аляксандр Мілінкевіч звязвае са стварэннем шырокага аб’яднання апазіцыі. Адной з функцый Руху “За Свабоду” ён бачыць у ініцыяванні такога аб’яднання. Пасля Рух можа стаць ініцыятарам стварэння шырокай правацэнтрысцкай партыі, якая аб’яднае “праеўрапейскія, прабеларускія сілы”.

Задачу Руху “За Свабоду” Аляксандр Мілінкевіч бачыць у тым, каб якраз рост праеўрапейскіх настрояў сярод беларусаў быў устойлівым. На яго думку, гэта будзе вельмі важна на прэзідэнцкіх выбарах пасля сыходу Лукашэнкі.

# Маўклівыя пратэсты і перамены

**Чым былі і чым станучца маўклівыя акцыі – дэтанатарам ці бразготкай? Авангардам будучай арміі пераменаў ці лакальнай з'явай, якая не будзе мець ніякіх сур'ёзных наступстваў? Які прагноз эканамічнай і сацыяльнай сітуацыі ў Беларусі – ці ператворыцца незадаволенасць у масавы публічны пратэст?**

На гэтыя тэмы на радыё "Свабода" разважалі кіраўнік гомельскай абласной арганізацыі Руху «За Свабоду» **Пётр Кузняцоў** і палітолаг **Дзяніс Мельянцоў**.

Мельянцоў кваліфікуе "апладысментныя" вечары як шлейфавыя акцыі паслявыбарчага года, удзельнікі іх збольшага складаюцца з актыву, які ўдзельнічаў у кампаніях кандыдатаў, арганізатары гэтых акцыяў таксама ўдзельнічалі ў папярэдніх кампаніях. На думку эксперта, гэтыя акцыі не мелі ніякага агульнага плана і мэты, гэта пратэст дзеля пратэсту, дэманстрацыя незадаволенасці без выразных палітычных патрабаванняў: *"Мэта тут можа быць толькі адна – нерваванне ўлады і дэманстрацыя грамадзянам, што нешта ў краіне адбываецца. Я б іх назваў ШОС-акцыямі альбо акцыямі адчаю"*.



*"Вуліца сама па сабе мае значэнне, калі ёсць палітычная сіла, гатовая ўзяць уладу, калі гэтая сіла мае стратэгічны план дзеянняў, праграму дзеянняў, калі ёсць структуры, гатовыя да рашучых дзеянняў і перамоваў з уладамі.*

Наўрад ці гэта авангард пераменаў, лічыць палітолаг: *"Вуліца сама па сабе мае значэнне, калі ёсць палітычная сіла, гатовая ўзяць уладу, калі гэтая сіла мае стратэгічны план дзеянняў, праграму дзеянняў, калі ёсць структуры, гатовыя да рашучых дзеянняў і перамоваў з уладамі. Тады вуліца адыгрывае ролю дадатковага інструмента ціску, як гэта было падчас "аранжавай" рэвалюцыі ва Украіне, падчас іншых усходнееўрапейскіх рэвалюцыяў. У нас пакуль што ёсць толькі гэты дадатковы інструмент, які сам па сабе наўрад ці правядзе да зменаў у краіне"*.

Кузняцоў адзначае, што ў Гомелі ў лепшыя дні маўклівых акцый выходзіла да тысячы чалавек: *"Я прыходзіў туды – я ведаў там максімум 10 чалавек, якія належалі да камандаў кандыдатаў і наагул да структураў апазіцыі ці грамадзянскай супольнасці. Гэта насамрэч пераважна новыя людзі, якія раней не былі ангажаваныя. Гэтыя людзі маюць шкалу каштоўнасцяў, якая не зусім адпавядае шкале сярэдняга беларуса. Гэта не просты люд, не рабацягі, гэта людзі дасведчаныя і адукаваныя"*.

Актывіст Руху згодны, што *"самі па сабе гэтыя акцыі не могуць прывесці да змены ўлады. Але гэтая кампанія закладае вельмі сур'ёзны падмурак у беларускім грамадстве дзеля будучых пераменаў. Фармуецца новая грамадзянская супольнасць, якая здольная да самаарганізацыі і да салідарнасці. Магчыма, яна яшчэ нездольная да таго, каб фармуляваць нейкія палітычныя патрабаванні і мэты, але ўжо здольная да таго,*



*Фармуецца новая грамадзянская супольнасць, якая здольная да самаарганізацыі і да салідарнасці <…> Маўклівая рэвалюцыя не можа змяніць уладу. Але яна добра рыхтуе глебу*

*каб рабіць пэўныя крокі, мае мужнасць на гэта"*.

Пётр Кузняцоў адзначае такі важны момант: *"Калі я быў на "аранжавай" рэвалюцыі ў Кіеве, там у першыя 10 дзён увесь час пад'яжджалі людзі з рэгіёнаў. У нас кожны раз імкнуліся зрабіць рэвалюцыю ў першы дзень і гэта трэба было абавязкова зрабіць у сталіцы. І пратэставы патэнцыял рэгіёнаў аказваўся па-за гэтым працэсам, максімум 10% з рэгіёнаў маглі прыехаць у Мінск. А калі хваля пратэсту ахоплівае ўсю краіну, гэта ўжо зусім іншы расклад. Лукашэнка часткова таму гэтак хваравіта рэагуе на тое, што адбываецца зараз, бо ён прывык лічыць, што толькі Мінск «свядомы», і таму варожы да яго, а рэгіёны, глыбінка, малыя райцэнтры – гэта яго апірышча. А зараз ён бачыць, што гэта не так"*.

Гэта якасна новы фармат і тут няважна, ці ёсць палітычныя патрабаванні, лічыць лідар гомельскай абласной арганізацыі Руху: *"Каб надышлі перамены, патрэбныя тры чыннікі. Людзі мусяць ведаць, за каго яны і супраць каго"*.

Працяг на с.5

# Пратэсты і перамены (працяг)

*"Яны мусяць бачыць, што іх шмат. І яны мусяць верыць у тое, што яны пераможуць.*

*Зараз у рэгіёнах людзі пачалі бачыць, што іх шмат. Засталося паверыць і тады на гэтай глебе можа з'явіцца новая палітычная сіла. Я паўтаруся: маўклівая рэвалюцыя не можа змяніць уладу. Але яна добра рыхтуе глебу".*

Ці будзе паглыбляцца крызіс? З паліталогіі вядомыя тры рэакцыі на пагаршэнне ўмоваў – лаяльнасьць, уцёкі і голас, пратэст. Дык калі крызіс усё ж будзе паглыбляцца, якой пераважна будзе рэакцыя беларускага грамадства?

*"Выбух восенню малаімаверны. Людзі маюць якія-ніякія ашчаджэнні, маюць навык выжывання ў цяжкіх эканамічных умовах, які застаўся з тых жа 90-х гадоў, частка баіцца згубіць працу, частка баіцца выходзіць на вуліцу пасля 19 снежня, няма выразнай альтэрнатывы, невядома, хто возьме на сябе адказнасць, калі перамены будуць. Ёсць Лукашэнка, ёсць кепская палітычная сітуацыя і ёсць выпаленае палітычнае поле.*

*Для вялікай масы насельніцтва гэта ёсць перадумовай таго, што зараз, відаць, варта ўсё ж перачакаць. Разам з тым увосень, хутчэй за ўсё, будзе чарговая хваля актывізму, будуць акцыі апазіцыі, якія, магчыма, збяруць вялікую колькасць удзельнікаў, але гэта будзе хутчэй данінай каляндарнай абраднасці і наўрад ці гэтыя пратэсты будуць мець нейкі вынік"*, – прагназуе Дзяніс Мельянцоў.

На думку Пятра Кузняцова, *"у Беларусі не будзе выбуху, матываванага чыста эканамічнымі чыннікамі. Лукашэнка, калі кажа пра стабілізацыю, спадзяецца хутчэй на грамадскую стабілізацыю, на прызвычайванне. Чалавек можа адаптавацца да ўсяго, калі ў яго ёсць час на гэта. Нават калі ледавік прыйшоў, людзі апрануліся ў скуры і прызвычаіліся.*

*Калі не будзе сістэмных якасных зрухаў з боку апазіцыі і грамадзянскай супольнасці, то людзі, хутчэй за ўсё, з чыста эканамічнага боку прызвычаяцца і перацерпяць.*

*Але магчымы і іншы варыянт. Тое, што зараз адбываецца, гэтая брутальнасць уладаў пры задушэнні гэтых маўклівых акцыяў правакуе цікавую рэакцыю грамадства. У інтэрнэце пішуць, што гэта бандыты, а людзі на вуліцах кажуць – фашысты. На генетычным узроўні людзі гэта памятаюць.*

*Калі гэта будзе працягвацца, можа здарыцца такое, што ў грамадстве два гэтыя фактары накладуцца адзін на адзін. Стаўленне да ўлады будзе такім, што яна не толькі няздольная забяспечыць нармальны лад жыцця, але яшчэ і б'е нашых жанчын і дзяцей. І калі не кожны чалавек гатовы бараніцца сам ці помсціць за сябе, то бараніць сваіх жанчын і дзяцей гатовая пераважная большасць.*

*Але аб'яднанне гэтых матываў можа адбыцца толькі тады, калі будуць актыўныя дзеянні старой і новай грамадзянскай супольнасці".*

# Юрый Салодкі: **Прыходзіла шмат новых людзей**

**Крымінальная справа супраць актывіста Руху "За Свабоду" Юрыя Салодкага распачатая не будзе. Замест яе – папярэджанне ад пракуратуры.**

Нагадаем, пасля 13-суткавага арышту за ўдзел у адной з акцый маўклівага пратэсту Юрый Салодкі быў дапытаны ў Віцебскай абласной пракуратуры па факце абразы Аляксандра Лукашэнкі (актывіст жыве ў Мінску, але прапісаны ў Віцебску). Ці будзе распачатая крымінальная справа, павінна было вызначыцца пасля лінгвістычнай экспертызы трох лістоў, адпраўленых з электроннага адраса Салодкага ў дзяржорганы з заклікам не выконваць загады незаконна абранага прэзідэнта.

Юрый Салодкі лічыць, што мэтай перасведу было папужаць яго і разам з тым іншых актыўных удзельнікаў акцый маўклівага пратэсту. "Да ўсяго, нядаўна быў зняты пракурор Віцебскай вобласці праз тэракт. Ідуць праверкі. Сітуацыя ў пракуратуры неспакойная. Таму, магчыма, там цяпер не да мяне", – выказвае і другую версію рухавец.

Са словаў Юрыя Салодкага, ён браў актыўны ўдзел у "Рэвалюцыі праз сацыяльныя сеткі". Стараўся "распавядаць пра маўклівыя акцыі пратэсту сябрам, сябрам сяброў", падтрымліваў сувязь з адміністратарамі адпаведнай суполкі ў "Вконтакте".



Юрый Салодкі адзначае, што на акцыі РПСС прыходзіла шмат новых людзей: "Палова ад усіх удзельнікаў – дакладна". Актывіст Руху прагназуе новы віток (магчыма, перафарматаваных) пратэстаў увосень з прычыны падзення ўзроўню жыцця.

# Пуцінскі неаімпералізм і Беларусь

**За апошні час Масква вуснамі Уладзіміра Пуціна зрабіла адразу некалькі неаімперскіх заяваў, датычных нашай краіны. Ці гэта толькі перадвыбарчы піяр расійскага прэм'ера-дуумвіратчыка, які супаў з эканамічным крызісам у Беларусі і перыядам прычыненых для яе дзвярэй у Еўропу.**



На Ўсерасійскім маладзёжным форуме Пуціна спыталі пра магчымасці стварэння адзінай дзяржавы Расіі і Беларусі. "Гэта а) – магчыма, б) – вельмі пажадана і в) – цалкам залежыць ад волевыяўлення беларускага народа", – адказаў той. І выказаў надзею, што беларусы будуць змагацца за такую перспектыву.

"*Заявы з вуснаў кіраўніцтва Расіі пра жаданасць далучэння, аншлюсу Беларусі лішнім разам ставяць пытанне пра мэтазгоднасць саюзаў з ёй. Напрыклад, Мытнага саюза. Бо гэта пагроза нацыянальнай бяспецы*", – пракаментаваў пуцінскія выказванні старшыня Руху "За Свабоду" **Аляксандр Мілінкевіч**.

Паводле яго, "*заявы Пуціна – гэта як палітычна-ідэалагічнае аздабленне перадвыбарчай барацьбы ў Расіі, так і суправаджанне эканамічнай экспансіі і ціску на Беларусь. Я ўжо не кажу, што гэта папросту абразлівыя для незалежнай беларускай дзяржавы і нацыі заявы. Адказнасць за тое, што яны наогул гучаць, ляжыць на цяперашніх беларускіх уладах, якія падаюць сваёй палітыкай нагоды для гэтага*".

"*Самастойная суверэнная Беларусь павінна абраць статус нейтральнай дзяржавы, распачаць шлях інтэграцыі з Еўразвязам і будаваць добрасуседскія ўзаемавыгадныя адносіны з Расіяй*", – заявіў лідар Руху.

А да гэтага пасля сустрэчы з беларускім калегам Міхаілам Мясніковічам Уладзімір Пуцін вымалёваў амбіцыйныя перспектывы Мытнага саюза Беларусі, Казахстана і Расіі.

«*Заявы Пуціна пра планы аб пераўтварэнні Мытнага саюза ў Еўразійскі эканамічны саюз і процівагу яго Еўрасаюзу не сталіся сенсацыяй. Ад пачатку было зразумела, што гэта неаімперскі праект Масквы, у які ёй удалося ўцягнуць нашую краіну праз сістэмны крызіс, да якога прывяла шматгадовая палітыка Лукашэнкі і ягонага ўрада. Масква скарыстала гэты заняпад, энергетычную залежнасць нашай краіны і ненасытную прагу Лукашэнкі да ўлады, якую ён імкнецца захаваць любой цаной*", – аналізуе Аляксандр Мілінкевіч.

У выніку, паводле яго слоў, "*цяперашняе кіраўніцтва краіны прадае тое, што яму не належыць. Гаворка вядзецца пра нацыянальнае багацце. Прыватызацыя павінна адбывацца па празрыстых правілах — паводле конкурсаў і з улікам інтарэсаў працоўных. Нашыя працавітыя людзі не павінны быць даважкам да прадпрыемстваў, якія будуць прададзеныя Маскве*".

Дзеянні ўладаў – "*на мяжы здачы суверэнітэту, на мяжы нацыянальнай здрады. Мытны саюз – гэта шкода нацыі і дзяржаве, гэта форма каланіялізму. Мытны саюз – праект выразна палітычны, геапалітычны, што пацвярджаюць і заявы расійскага прэм'ер-міністра. Адна з мэтаў – не пусціць Беларусь у Еўропу. І Беларусь уцягнулі ў гэты геапалітычны праект, а продаж буйных прадпрыемстваў Расіі можа абцяжарыць залежнасць*".

Прычым гэта, зазначае лідар Руху "За Свабоду", адбываецца насуперак тэндэнцыі росту ў Беларусі праеўрапейскіх настрояў. Усё больш беларусаў хочуць жыць па-еўрапейску, хочуць у Еўропу, але на шляху туды ўзводзіцца сцяна.

ЭКАНОМІКА

## Скурчаныя заробкі

Па выніках апытання НІСЭПД (Вільня), 34,2% беларусаў адчуваюць сапраўдны шок ад росту цэн, 38,3% адзначылі, што ён сур'ёзна адбіваецца на іх жыцці, а проста адбіваецца і выклікае занепакоенасць у 24,7%. «Практычна не адбіваецца, паколькі рост коштаў кампенсуецца ростам даходаў» – адказ 2,2% апытаных.

Між тым афіцыйная статыстыка зафіксавала істотнае падзенне ўзроўню даходаў беларусаў.

2,9% беларусаў атрымліваюць да 500 тысяч рублёў, 4,3% – 500-600, 10,8% – 600-800, 12,5% – 800-1000, 28,7% – 1-1,5 мільёна, 19,5% – 1,5-2, 14,8% – 2-3, толькі 6,5% – болей 3 мільёнаў рублёў. 3 мільёны – гэта абяцаны сярэдні заробак у 500 долараў, калі лічыць па ніжняй мяжы рэальнага валютнага курса.

Больш таго, на другую палову жніўня чакаецца яшчэ адна хваля дэвальвацыі беларускага рубля мінімум на 20%.

У такіх умовах, без горкай усмешкі не можа ўспрымацца інфармацыя пра тое, што ўрад зацвердзіў план дзеянняў для выканання праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны на бліжэйшую пяцігодку, які прадугледжвае рост заробкаў да 1000 даляраў.

# Прафесійная армія ў Беларусі: ці рэальна?

**Пытанне ўвядзення прафесійнага войска – адно з найболей дыскусійных у беларускім грамадстве. У межах "Народнай праграмы" (Prahrama.by) эксперты паспрабавалі разабрацца, ці выгаднае скасаванне вайсковай павіннасці.**



## Збавенне ад "дзедаўшчыны"

Палітолаг **Дзяніс Мельянцоў** зазначае, што, па-першае, у прафесійным войску будуць служыць людзі, добраахвотна абраўшыя вайсковую кар'еру, а не прызыўнікі, якія імкнуцца як мага хутчэй адбыць ненавісную павіннасць. Гэта значыць, падвысіцца ўзровень кваліфікацыі вайскоўцаў і баяздольнасць беларускага войска.

Па-другое, прафесіяналізацыя войска дазволіць выкарыстоўваць больш высокатэхналагічнае абсталяванне і ўзбраенне, а таксама скараціць колькасны склад войска пры захаванні ўзроўню яго баяздольнасці. Сучасныя ўзброеныя канфлікты не патрабуюць усеагульнай мабілізацыі. Яны патрабуюць мабільных войскаў хуткага разгортвання, высокадакладнай тэхналагічнай зброі і, адпаведна, кваліфікаваных кадраў.

Па-трэцяе, пераход да контрактнага войска дасць грамадзянам свабоду выбару: служыць або не служыць.

Чацвертае: прафесійнае войска – найлепшы сродак збавення ад "дзедаўшчыны".

"*Найбольш істотны контраргумент – фінансавы. Прыхільнікі ўсеагульнай вайсковай павіннасці небеспадстаўна сцвярджаюць, што перавод войска на прафесійную аснову запатрабуе вялікіх выдаткаў і вырашэння пытання падрыхтоўкі асабістага складу*", – кажа эксперт.

## Паміж NATO і Расіяй

Плюсаў нямала, даводзіць і ваенны аглядальнік **Аляксандр Алесін**: больш кваліфікаваныя вайсковыя кадры, беражлівыя адносіны да ваеннай тэхнікі і эканомія рэсурсаў. Нарэшце, прафесійнае войска пазбавіць службы тых, хто не хоча служыць з-за фізічнай слабасці ці маральнай непадрыхтаванасці.

Аднак ёсць адзін мінус, што пераважае над плюсамі, адзначае эксперт: "*Утрыманне прафесійнага войска павінна быць такім, каб у таго, хто ідзе туды служыць, не было ваганняў ні ў матэрыяльным плане, ні ў ідэалагічным.*

*То бок, з эканомікай павінна быць усё добра. Але і пры гэтым нашу армію давядзецца скарачаць у шмат разоў – мінімум у чатыры, каб забяспечыць прафесійным вайскоўцам узровень жыцця «сярэдняга класу».*

*"Удзел у ваенных блоках дае магчымасць скарачаць войска. Скажам, Беларусь магла бы гэта зрабіць пры ўмове, што нас абароніць NATO (увайдзі мы туды). Што тычыцца сённяшняга ваеннага супрацоўніцтва Мінска і Масквы, для нас абарона заходніх межаў – свайго кшталту абавязак, плата за эканамічныя ільготы. Таму мы і ўтрымліваем такое войска, як цяпер. Нават не пераходзячы на прафесійную аснову, яго можна значна скарачаць з наступнай мадэрнізацыяй ужо сёння*", – кажа эксперт "Народнай праграмы".

## Не аўтаматам адзіным

Сваё меркаванне выказаў **Іван Шыла**, маладафронтавец, што нядаўна адслужыў:

"*Тое, што пераход да кантрактнай сістэмы і адмова ад прызыву неабходныя, для мяне пытанне відавочнае. Разуменне неабходнасці і непазбежнасці адмовы ад агульнага прызыву сярод афіцэраў ёсць*".

Шыла нагадвае, што нягледзячы на афіцыйную пазіцыю Міністэрства абароны, якое вымушана бараніць існуючы стан рэчаў, нават на афіцыйным узроўні робяцца пэўныя захады ў гэтым кірунку. Напрыклад, канцэпцыя развіцця войска з 2005 па 2010 гады прадугледжвала рост колькасці "кантрактнікаў" да 51% ад агульнай колькасці ваеннаслужачых шараговага і сяржанцкага складу.

"*Асноўная тэза ваенных СМІ і многіх афіцэраў адносна неабходнасці захавання прызыўной сістэмы – маўляў, ніводнае прафесійнае войска войны не выйгравала.*

*Як па мне, дык аргумент кволенькі. Тут, на маю думку, варта дадаць яшчэ і тое, што ніводная нацыянальная армія, якая адмовілася ад тэрміновай службы, да яе так і не вярнулася*", – кажа Шыла.

На яго думку, эфектыўнасць, большую падрыхтаванасць і матываванасць асабістага складу прафесійных войскаў абмяркоўваць наогул не варта. Разам з тым, трэба казаць пра плюсы адмовы ад прызыву: "*Перадусім, гэта вырашэнне праблемы пазастатутных узаемаадносінаў, канкрэтна звязаных і пабудаваных на прызыву, змяншэння ўзроўню карупцыі сябраў медычных камісіяў і супрацоўнікаў ваенкаматаў, магчымасць выбару для маладых людзей. Апошняе мяне таксама падаецца істотным – бараніць Радзіму можна не толькі з аўтаматам у руках, атрыманне адукацыі – таксама плюс нацыянальнай бяспецы краіны*".

На думку Шылы, важна прызнаць наяўнасць праблемаў і вызначыцца з канцэпцыяй, якая б тыя праблемы ўлічвала. Бо сённяшняя пазіцыя Мінабароны, што ў нашым войску праблемаў няма, вельмі шкодная для яго перспектываў.

***Скарочана. Артыкул цалкам на www.pyx.by***

# 20-годдзе Незалежнасці Беларусі

**Шэраг мерапрыемстваў пройдуць напрыканцы лета і напачатку восені з нагоды 20-годдзя абвяшчэння незалежнасці Беларусі.**



У аргкамітэт па святкаванні гэтай даты ўвайшлі Рух “За Свабоду”, Партыя БНФ, аргкамітэт па стварэнні партыі “Беларуская хрысціянская дэмакратыя”, “Малады фронт” і рух “Разам”. Мяркуецца, што склад аргкамітэта пашырыцца за кошт іншых дэмакратычных партый і арганізацый.

Мерапрыемствы пачнуцца 25 жніўня (20 год таму ў гэты дзень Вярхоўны савет Беларускай ССР надаў статус канстытуцыйнага закона Дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце, прынятай 27 ліпеня 1990 года), а скончацца 19 верасня (у гэты дзень у 1990-м дэпутаты ВС 12-га склікання зацвердзілі назву нашай краіны – Рэспубліка Беларусь, а таксама сімволіку – герб “Пагоня” і бел-чырвона-белы сцяг).

Што да мерапрыемстваў у межах святкавання 20-годдзя незалежнасці, то 25 жніўня пры спрыянні мастацкай суполкі “Пагоня” адкрыецца тэматычная выстава. Выстава арганізуецца на новым офісе Партыі БНФ па адрасе Крапоткіна, 93а.

Рыхтуецца буйная канферэнцыя, падчас якой гісторыкамі, эканамістамі, іншымі адмыслоўцамі, а таксама тымі, хто спрычыніўся да аднаўлення незалежнасці 20 гадоў таму, будзе зроблены аналіз таго, што дала Беларусі і ўсім нам незалежнасць. Ад нацыянальнага спорту да нацыянальнай культуры.

На канферэнцыі будзе прыняты зварот да грамадзян Беларусі, бо, на думку сябраў аргкамітэта, сёння існуе як мінімум пагроза ўпадання ў эканамічную залежнасць Беларусі ад Масквы.

Таксама адбудзецца ўскладанне кветак да магілаў і помнікаў тых, дзякуючы каму аднавілася незалежнасць Беларусі. Гэта і дзеячы нацыянальнага руху, Адраджэння пачатку 20-га стагоддзя, і дэпутаты Вярхоўнага савета 12-га склікання, што, на жаль, пайшлі з жыцця.

Для моладзі, народжанай у 1991 годзе і пазней (то бок, якія жылі толькі ў незалежнай Беларусі), будзе праведзены творчы конкурс.

# Насценны арт-пратэст

**Сусветная “Выстава па серадах” – гэта знак салідарнасці з удзельнікамі “маўклівых” акцый пратэсту ў Беларусі.**

Яна ўжо адбылася ў гарадах 10 краін свету. У тым ліку ў Мінску з удзелам актывістаў Руху “За Свабоду”. Адзін з ініцыятараў праекта мастак **Дзмітрый Урубель**, які жыве ў Берліне, распавёў Рух.by, чаму менавіта Беларусь прыцягнула яго ўвагу і якім ён бачыць будучыню творча-салідарніцкіх серад.

Ад пачатку ідэяй было звязаць гарады пратэстаў – Мінск, Афіны і Мадрыд, але з часам падзеі ў Беларусі далі глебу для сусветнага праекта вулічнага мастацтва: адначасова па ўсім свеце на сценах будынкаў розных гарадоў з’яўляюцца малюнкі з выявамі падзеяў у Беларусі.

Стаць удзельнікам можа кожны – трэба спампаваць малюнак з vrubel-timofeeva.de, раздрукаваць яго і наляпіць на сцяну ў сваім горадзе. Потым сфатаграфаваць і даслаць у віртуальную галерэю.

Рух “За Свабоду” звязаўся з Дзмітрыем



VRUBEL-TIMOFEEVA.DE

Урубелем, каб задаць некалькі пытанняў.

*“Сітуацыя ў Беларусі – самая абуральная і роспачная. Сённяшняя Беларусь – гэта сімвал імкнення людзей да свабоды. З іншага боку, Беларусь – самы яркі сімвал несправядлівай таталітарнай улады, бессэнсоўнага і бязлітаснага гвалту таталітарызму. Па-трэцяе, Беларусь – гэта сімвал нямогласці Захаду перад дыктатурамі, ад якіх яны тым ці іншым чынам залежаць. Таму з мастацкага пункту гледжання, Беларусь – гэта завершаны мастацкі вобраз*”, – кажа Урубель.

На ягоную думку, “*асноўная праблема барацьбы з тыраніяй – адсутнасць сусветнай салідарнасці паміж усімі, хто змагаецца з тыраніяй у сусветным маштабе. Таму, нават калі дэманстрацыі па серадах захлынуцца ў самой Беларусі, няспынная падтрымка беларускіх акцый пратэсту ва ўсім свеце – гэта вельмі важна*”.

Газета выдаецца Рухам “За Свабоду”. Наклад 299 ас. Распаўсюджваецца на правах унутранай дакументацыі бясплатна. Падпісана ў друк 12.08.2011 г. Кантакты Рэдакцыі: тэлефон: 2808863, е-пошта: info@pyx.by